# Казка з майго маленства

*Светлай памяці майго дзядулі*

Сядзіць аднойчы дзядуля Валодзя ў зале і кажа бабулі Вользе:

– Нешта ў мяне ногі мерзнуць.

А тая яму адказвае:

– А давай купім дыван, засцелем яго на падлогу – і будзе тваім нагам цёпла.

Сказана як звязана. Атрымалі дзядуля з бабуляй пенсіі і вырашылі купіць дыван. На сямейнай нарадзе вырашана было, што па абноўку паедуць у стольны горад Брэст дзядуля Валодзя з любімымі ўнучкамі Ксюшай, Кацяй і Златай.

Настаў доўгачаканы дзень. Дзядуля з унучкамі селі ў электрычку і паехалі ў Брэст. Выйшлі і накіраваліся да крамы "Дываны Брэста". Доўга ці коратка ішлі, але нарэшце да магазіна дайшлі.

Доўга хадзілі дзядуля Валодзя і любімыя ўнучкі паміж дыванамі, але ніяк не маглі зрабіць выбар: то колер не падабаецца, то памер не падыходзіць… Стаміліся і вырашылі крыху адпачыць. Пайшлі ў кавярню. Заказаў дзядуля любімым унучкамі Ксюшы, Каці і Злаце ёгурты, шакаладкі, гарбату і марожанае.

Адпачылі, пад'елі – і з новымі сіламі на пошукі прывабнага дывана. Зайшлі ў краму. Ідзе дзядуля, брыдзе паміж дыванамі, прыглядаецца, раптам бачыць: стаіць у кутку дыван, ніхто ў яго бок не глядзіць, ніхто да яго не падыходзіць. І так шкада стала гэтага дыванка! Вырашыў дзядуля: куплю яго. І сказаў любімым унучкам Ксюшы, Каці і Злаце:

– Усё, выбраў. Вось мой дыван!

Сказана – зроблена. Разлічыўся дзядуля Валодзя за дыван і пайшоў з любімымі ўнучкамі на вакзал. Прыйшлі, а электрычку ў абед адмянілі: рамонт чыгункі. Што рабіць?! Чакаць. А ўсе лаўкі на вакзале заняты, сесці няма дзе, людзей шмат. І вырашыў дзядуля разаслаць дыван на газоне, каб было дзе прысесці.

Ледзь толькі разаслаў, як у імгенне вока над галовой з'явілася хмара і лінуў дождж як з вядра. І ліў толькі над дыванам. Дзіва дзіўнае! Вымыўся шэры дыванок ад пылу і зазіхацеў усімі колерамі вясёлкі. Тым часам наляцеў моцны вецер, і не паспеў дзядуля вокам міргнуць, як дыван стаў сухім.

– Глядзі ты! – толькі і змог прамовіць дзядуля.

Уселіся на абноўлены дыванок дзядуля Валодзя і любімыя ўнучкі Ксюша, Каця і Злата. Раптам адчулі, што дыван разам з імі ўверх падымаецца. Не паспелі яны перапалохацца, як дыван ім гаворыць чалавечым голасам:

– Не пужайцеся, я не звычайны, а чарадзейны кілім-самалёт. Навошта вечара чакаць? Зараз дома будзем.

Не паспеў ніхто і слова прамовіць, а чарадзейны кілім-самалёт ужо апускаўся на двор каля хаты дзядулі Валодзі ў вёсцы Маціевічы. Падняліся

дзядуля і любімыя ўнучкі Ксюша, Каця і Злата, а дыван сам сабою ў трубачку скруціўся.

Заходзяць дзядуля і ўнучкі ў хату, а там бабуля Вольга і дочкі Таіса, Люда і Ганна гарбату з чабору п’юць.

– А вы тут адкуль? – пытаецца бабуля. – Цягнік жа адмянілі, мы вас толькі ўвечары чакалі.

І тут уплывае ў кухню чарадзейны кілім і пытаецца:

– Гаспадыня, а дзе маё месца?

Бабуля разгубілася, а потым і кажа:

– Ды сам можаш выбраць сабе месца.

Заляцеў дыван у першы пакой, разлёгся на падлозе. А тут прыбеглі ўнучкі, гармідар усчалі. Не спадабалася кіліму – перабраўся ў спальню. Ціха, але ложкі па краях ціснуць, ды і сумна аднаму. Паляжаў, паляжаў і ў залу пераляцеў. А тут! Прасторна, мэбля на дыване не стаіць, калі унучкі і заходзяць, то доўга тут не сядзяць, ножкі з краечку ставяць. Любата! Тэлевізар амаль увесь дзень не выключаецца. Дзядуля навіны глядзіць, з дыванком абмяркоўвае. А калі ў горад Жабінку дзядулю спатрэбіцца, то чарадзейны кілім трубачкай скруціцца, праз фортку вылеціць і дзядулю куды трэба імгненна дамчыць, а потым назад такім жа чынам вернецца.

А хто не верыць – хай прыедзе ў Мацievічы і праверыць…

***Цупа Злата Расціславаўна,***
вучаніца IX класа ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. Жабінкі»